# МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ XX СТАГОДДЗЯ

## ВІЦЕБСКАЯ ШКОЛА



Казімір Малевіч Марк Шагал Алеся Паслядовіч
Уладзімір Цэслер Генадзь Хацкевіч Людміла Русава
Руслан Вашкевіч

ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Логвінаў

В. Акудовіч  Л. Вольскі  А. Глобус  Г. Кісліцына  А. Хадановіч

# МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ XX СТАГОДДЗЯ

## ВІЦЕБСКАЯ ШКОЛА

КАЗІМІР МАЛЕВІЧ
МАРК ШАГАЛ
АЛЕСЯ ПАСЛЯДОВІЧ
УЛАДЗІМІР ЦЭСЛЕР
ГЕНАДЗЬ ХАЦКЕВІЧ
ЛЮДМІЛА РУСАВА
РУСЛАН ВАШКЕВІЧ

Логвінаў

Мастацтва Беларусі XX стагоддзя. Віцебская школа / В. Акудовіч Л. Вольскі А. Глобус Г. Кісліцына А. Хадановіч. – Вільня, 2017. – 112 с.

Кніга «Мастацтва Беларусі XX стагоддзя. Віцебская школа» створана для дзяцей. Падыходзіць яна і для сямейнага чытання. У кнізе змешчаны карціны сямі мастакоў Беларусі і гульні на іх аснове, прыведзены цікавыя факты з жыцця майстроў.

© Калектыў аўтараў, 2017
© Logvino Literatūros namai, 2017

ISBN 978-609-8147-88-9

# Прадмова

Дарагія чытачы, вы трымаеце ў руках кнігу, якая будзе цікавай дзецям і дарослым. Праз казку і гульню яна пазнаёміць з карцінамі выдатных беларускіх мастакоў. Кніга дапаможа дзецям зразумець складаныя творы сучаснага мастацтва і далучыцца да яго.

Беларускае мастацтва XX стагоддзя ў свеце вядома ў першую чаргу дзякуючы Віцебскай школе. За кароткі тэрмін у Віцебску адбылося шмат культурных падзей: Марк Шагал у 1919 годзе адкрыў першае мастацкае вучылішча, у тым жа годзе туды прыехалі выкладаць Эль Лісіцкі і Казімір Малевіч, якія неўзабаве стварылі групу УНОВИС. Гэта быў час рэвалюцыйнага і рамантычнага авангарду, час з'яўлення магутных ідэй, якія да нашага часу ўплываюць на мастакоў усяго свету.

Сёння ідэі і творы Віцебскай школы вывучаюць у мастацкіх інстытутах. Нам хочацца не толькі пазнаёміць чытачоў з гэтай школай, але і паказаць эвалюцыю яе ідэй. Сучасныя беларускія мастакі ў сваіх творчых пошуках часта звяртаюцца да набыткаў віцебскіх авангардыстаў. Таму ў кнізе вы сустрэнеце постаці мастакоў і з найноўшай гісторыі беларускай культуры.

# Пра тое, як можна чытаць гэтую кнігу і гуляць з ёю

Чытаць яе можна паслядоўна, а можна пачаць са старонак пра вашага любімага мастака ці таго, пра каго вы зусім нічога не ведалі. Так можа быць нават цікавей!

У кнізе вы знойдзеце казкі, вершы, факты з жыцця мастакоў і гульні. Казкі і вершы напісалі вядомыя беларускія пісьменнікі і паэты. Сюжэты гэтых твораў бяруць вытокі з карцін нашых цудоўных мастакоў. Гульні і творчыя заданні дапамогуць дзецям зразумець сакрэты і таямніцы мастацтва. У гэтай кнізе можна маляваць, з ёй можна гуляць, яе можна і трэба чытаць і разглядаць, каб навучыцца любіць і разумець сучаснае беларускае мастацтва.

Атрымлівайце асалоду

ад мастацтва!

Гуляйце з мастацтвам!

Рабіце мастацтва!

Не марудзьце і перагортвайце старонку...

# Казімір Малевіч



11.02.1879, Кіеў – 15.05.1935, Ленінград

Казімір Малевіч – заснавальнік і галоўны прадстаўнік супрэматызму – напрамку ў абстрактным мастацтве, якое засяроджваецца на спалучэнні афарбаваных простых геаметрычных фігур і накладзеных на плоскасць аб'ёмных форм. З 1919 па 1922 Малевіч жыў, працаваў і выкладаў у Віцебску, дзе ў 1920 годзе стварыў мастацкую школу УНОВИС (Утвердители Нового Искусства).

# Шэдэўр

К. Малевіч. Чорны квадрат. 1915



? Як ты думаеш, што гэта? Чорная дзірка? Акно? Нішто?

Некаторыя думаюць, што Казімір Малевіч пісаў такія карціны таму, што не ўмеў маляваць. Вядома ж, гэта няпраўда! Ён хацеў прыбраць з жывапісу ўсё лішняе і пакінуць толькі галоўнае – асноўныя формы і колеры. Гэта самая вядомая карціна Малевіча, яна паказвае, як ідэі ў мастацтве сталі больш важнымі за ўменне прыгожа і рэалістычна маляваць.



К. Малевіч. Лесаруб. 1912 – 1913

Адам Глобус

# Лесаруб

Казка пра героя карціны
Казіміра Малевіча «Лесаруб»

На ўскрайку горада Віцебска жыў лесаруб. Звалі яго Казімірам. Раніцай ён ехаў у лес, дзе сек дрэвы. Лесаруб выбіраў найлепшыя са старых дрэў. Валіў іх. Абсякаў сукі і галіны. Чыстыя бярвенні Казімір завозіў на фабрыку. Там іх распускалі на дошкі. Тыя добра высушвалі. З сухіх дошак на фабрыцы рабілі мэблю. Шафы і буфеты, сталы і крэслы, ложкі і камоды майстры выраблялі з дрэва, якое нарыхтоўваў для іх лесаруб Казімір.

Усе ў Віцебску любілі і паважалі працавітага лесаруба. Называлі яго волатам, бо сякера, якой Казімір валіў лес, была такая цяжкая, што ніхто, акрамя гаспадара, нават не мог адарваць яе ад зямлі. Шмат хто спрабаваў падняць сякеру, але ніхто так і не змог. Гэты інструмент перайшоў да волата ад бацькі Севярына, а той атрымаў яе ад свайго дзеда Міралюба. І бацька, і дзед, і прадзед у Казіміра, як і ён сам, былі працаўнікамі, лесарубамі і волатамі. Калі бацька перадаваў сыну важкую сякеру, ён наказаў берагчы яе, патлумачыўшы, што ў цяжкія часы яна дапаможа ў змаганні з ворагам.

Як бацька Севярын сказаў, так яно і здарылася. У адзін цёмны дзень у лес пад Віцебскам прыляцеў трохгаловы цмок з бліскучым мячом у лапе. Пачвара мела доўгі хвост, зялёныя крылы і чатыры лапы з жалезнымі кіпцямі. Языкі ў цмока былі раздвоеныя, як у змяі. Вочы лупатыя, як у жабы. Шыі доўгія, як у жырафы. На галовах у цмока сядзелі залатыя кароны.

– Гэты лес цяпер мой! Буду тут жыць і панаваць! З сённяшняга дня ніхто з майго лесу не вынесе ні ягады, ні грыба, ні галінкі, ні травінкі, ні пылінкі! – сказаў цмок лесарубу і дыхнуў на яго чырвоным полымем адразу з трох шырокіх пашчаў.

– Як скажаш, так і будзе, шаноўны цмок. Ты магутны і ваяўнічы. У цябе жалезныя кіпці, полымя ў трох пашчах і меч у кіпцястай лапе. Толькі давай мы з табою пацягаемся. Хто з нас больш дужы, той і загады раздаваць стане, а хто слабы, той іх пачне слухаць і выконваць. Ты згодны, шаноўны цмок? – запытаў Казімір у зялёнакрылай пачвары.

– Ты, лесаруб-чалавечак, пытаешся ў мяне, магутнага цмока?! Ці згодны я з табою цягацца? Вядома, згодны! У цябе ёсць сякера, я маю меч. Бітву можна пачаць тут і цяпер, неадкладна!

Лесаруб выслухаў самаўпэўненага цмока і прапанаваў іншае:

– Я не хачу скалечыць такога цудоўнага цмока, як ты. Таму прапаную падкінуць зброю ў неба. Хто з нас вышэй яе падкіне, той і пераможа!

Цмок размахнуўся і шпурнуў у неба бліскучы меч. Той даляцеў ажно да хмары і праз тры хвіліны вярнуўся ў цмокаву лапу. Лесаруб размахнуўся і кінуў у неба сякеру. Тры гадзіны волат і цмок чакалі, пакуль яна вернецца з неба на зямлю.

– Твая сякера лягчэйшая за мой меч, таму давай памяняемся зброяй. Цяпер я кіну ў неба тваю сякеру, а ты падкінеш мой меч! – прапанаваў хітры цмок.

Казімір узяў цмокаў меч і шпурнуў яго ў бок месяца. Меч ударыўся аб яго і рассыпаўся на срэбны пыл. З той ночы ў месяца і з'явіўся металічны прахалодны бляск.

Цмок хацеў узняць лесарубаву сякеру і засекчы Казіміра, але гад не змог адарваць яе ад зямлі. Давялося цмоку скарыцца і пачаць слухацца лесаруба. Той загадаў яму ўладкавацца на працу ў вандроўны заацырк. Цяпер трохгаловы цмок выступае на арэне з вогненным шоу.

А лесаруб Казімір як працаваў, так і працуе з каштоўным дрэвам, з якога віцебскія майстры робяць цудоўную мэблю. Яны вырабляюць сталы і крэслы, ложкі і камоды, буфеты і шафы.

# Факты з жыцця

У Казіміра Малевіча было чатыры сястры і чатыры браты.

У 1913 годзе мастак стварыў дэкарацыі і касцюмы для футурыстычнай оперы «Перамога над Сонцам». Менавіта падчас працы над пастаноўкай оперы да яго прыйшла ідэя «Чорнага квадрата»: заднік дэкарацыі ўяўляў сабой квадрат, напалову зафарбаваны чорным.

У лістападзе 1919 года мастак пачаў кіраваць майстэрняй у Віцебскім народным мастацкім вучылішчы, якое ўзначальваў Марк Шагал.

У студзені 1920 года ў Віцебску Малевіч аб'яднаў сваіх вучняў у групу УНОВИС, яе назва ўтворана ад скарочанага словазлучэння на рускай мове «сцвярджальнікі новага мастацтва». У гонар гэтага аб'яднання мастак нават назваў сваю дачку Унай.

Малевіч любіў прыдумляць новыя словы. Напрыклад: земляніты, планіты, развязь, стараватары, цветапіс. Як ты думаеш, што значаць гэтыя словы? Упішы свае варыянты значэнняў, а правільныя адказы паглядзі на старонцы 16.

Земляніты –

Планіты –

Развязь –

Стараватары –

Цветапіс –



К. Малевіч. Купальшчык. 1911

## Земляніты

– людзі будучыні. На думку Малевіча, дзякуючы развіццю аэратранспарта земляніты не будуць прывязаны да зямлі, таму для іх неабходна будзе праектаваць адмысловыя дамы – планіты.

## Планіты

– будынкі будучыні. Мастак ствараў іх толькі з лаканічных геаметрычных форм. Да таго ж планіты павінны валодаць адной незвычайнай уласцівасцю: яны павінны лятаць.

## Развязь

– супрацьпастаўленне звязнасці, сувязі.

## Стараватары

– старыя наватары. Інакш кажучы, тыя, хто ўшаноўвае мастацкія творы мінулага.

## Цветапіс

– стварэнне карцін толькі з дапамогай геаметрычных каляровых форм. Уяві сабе сіні круг ці чырвоны квадрат – гэта і ёсць цветапіс. Мастацтвазнаўцы называюць такі падыход да малявання супрэматызмам.



К. Малевіч. Супрэматызм. 1915

Намалюй планіты і землянітаў



Па легендзе, у 1930 годзе Малевіч прыдумаў гранёную шклянку. Вось як яна выглядае. Напоўні яе чым-небудзь незвычайным.



К. Малевіч. Тачыльшчык. 1912 – 1913



К. Малевіч. Галава селяніна. 1928 – 1929

# Верш



Мастак Малевіч Казімір
Увесь мастацкі свет змяніў.
Заклаў пачатак новай школы
І маляваў квадраты, колы.
Ужо стагоддзе людзі рады
Глядзець на гэтыя квадраты.

Лявон Вольскі



К. Малевіч. Сялянка. 1930

# ГУЛЬНЯ

Тут мы пакінулі зусім чорны ліст.
Што на ім можна намаляваць?
Нічога ж не будзе відаць!



Ты вазьмі белы аловак, крэйду або фарбу
і малюй тое, што схавана ў гэтай
непрагляднай цемры.

МАЛЮЙ ТУТ

# Марк Шагал



7.07.1887, Віцебск – 28.03.1985, Сэн-Поль-дэ-Ванс, Праванс, Францыя

Марк Шагал – адзін з самых вядомых прадстаўнікоў мастацкага авангарду ХХ стагоддзя. Акрамя графікі і жывапісу займаўся сцэнаграфіяй, пісаў вершы на мове ідыш.

# Шэдэўр

М. Шагал.
Я і вёска. 1911



? Паглядзі, што на гэтай карціне не так, як у жыцці? «Наш унутраны свет рэальны», – казаў Шагал. Як ты думаеш, што гэта значыць?

Марк Шагал напісаў гэтую карціну ў 1911 годзе ў Парыжы. Падобна на сон, але, магчыма, гэта мара. Шагал сумаваў па доме, і ў гэтай карціне ён сумясціў свае ўспаміны дзяцінства і казкі, якія ён чуў, калі быў маленькім.



М. Шагал. Над горадам. 1918

Валянцін Акудовіч

# Над горадам з Бэлай

Казка, напісаная паводле карціны
Марка Шагала «Над горадам»

Марк любіў лазіць па дрэвах…

– Усе хлапчукі лазяць на дрэвы, – заўважыш ты. І будзеш мець рацыю. Толькі Марк караскаўся на самыя вершаліны не так сабе. Адтуль было бліжэй да неба.

Шкада, што дрэвы не лётаюць, думаў ён, вяртаючыся долу. Як іх ні разгойдвай, яны ўсё роўна чапляюцца за зямлю.

З гэтага не складана зразумець, што мацней за ўсё на свеце Марк любіў неба. Яно было высокае, і там бавіліся самі з сабой бялюткія, як аблачыны, анёлкі.

– Я хачу лётаць, – аднойчы прызнаўся ён найлепшай сяброўцы Тэі. – Ты паляціш са мной?

Тэя зморшчыла кірпаты носік і, як дарослая, разважліва сказала:

– У небе пуста і холадна. Што там рабіць?

– Лётаць. Гэта так цудоўна – лётаць!

– Людзі не птушкі, – нагадала Тэя і пабегла да мамы.

Марк спачатку засумаваў, а потым падумаў: калі б я намаляваў, як мы разам кружым над горадам, ёй таксама захацелася б у неба.

Не марнуючы часу, ён пайшоў да барадатага мастака Пэна.

– Ты хочаш навучыцца маляваць? – запытаўся Пэн.

– Не, я хачу навучыцца лётаць, – сказаў Марк.

– Гэта адно і тое ж, – патлумачыў Пэн і паклаў на стол паперу, фарбы і пэндзлік...

Мінула колькі год, Марк усё больш упэўнена пачуваўся ў нябёсах. Вяртаючыся ад мастака дахаты, ён паказваў Тэі малюнкі, дзе неба поўнілася не толькі людзьмі і рознымі дзівоснымі стварэннямі, але такімі самымі, як на зямлі, дамамі і нават цэлымі вуліцамі. Аднак Тэя ўсё роўна адмаўлялася лётаць невядома дзеля чаго. Да таго ж яна нават на дрэвах баялася гойдацца.

Тады Марк забыўся на Тэю, як і ўвогуле на дзяўчат. І толькі значна пазней, калі ўжо стаў насіць гальштук, ён сустрэў дзяўчыну, якую звалі Бэла.

Пры першай сустрэчы маладыя людзі доўга глядзелі адно аднаму ў вочы, і Марк падумаў, што ведае дзяўчыну ўсё сваё жыццё.

– Ты паляціш са мной у нябёсы? – першае, пра што спытаўся Марк.

– Так, мы паляцім з табой, – без ніякай развагі адказала Бэла.

І яны, абняўшыся, паляцелі…

А я, дзівячыся, як яны кружаць над сваім улюбёным Віцебскам, думаў: відаць, усе мы народжаныя лётаць, толькі баімся вышыні…





М. Шагал. Марсава поле. 1954

# Факты з жыцця

- Пражыў Шагал амаль сто гадоў.
- У дзяцінстве бацькі называлі Марка Мошка.
- У 1906 годзе ў Віцебску Марк Шагал вучыўся ў вядомага жывапісца Юдаля Пэна.
- У Пецярбургу Шагал займаўся ў мастацкай школе Таварыства заахвочвання мастацтваў, якую ўзначальваў Мікалай Рэрых (у школу Шагала прынялі без іспыту і адразу на трэці курс). З 1909 па 1911 год вучыўся ў Леона Бакста.
- У 1915 годзе адбылося вяселле Марка Шагала з Бэлай Разенфельд, якая стала музай мастака на ўсё жыццё.
- У 1917 годзе Шагал вярнуўся ў Віцебск. 28 студзеня 1919 года ён адкрыў Віцебскае мастацкае вучылішча.
- У 1923 годзе па запрашэнні Амбруаза Валара сям'я Шагала пераехала ў Парыж.
- У 1964 годзе Шагал распісаў плафон парыжскай Гранд-апера па замове прэзідэнта Францыі Шарля дэ Голя. Калі ўважліва паглядзець на гэты роспіс, то можна ўбачыць стары Віцебск, якім яго памятаў Шагал.

# Верш

Марк Шагал – кароль паветра!
Зараз раскажу пра мэтра:
У Шагала неўспадзеў
Цэлы Віцебск паляцеў.

Нават у Парыжы й Канах
Ад радзімы не ўцячы –
Віцебск лётае ўначы!
Неба з парай закаханых,

А на дахах – скрыпачы.
Так іграюць, віртуозы,
Што лятуць каровы, козы.
(У каровы – парасон.)

Пеўні. Поўні. Свечкі. Слёзы.
Бэла. Віцебск. Светлы сон.
–
І яшчэ адна рэмарка:
Пачытайце вершы Марка,
Каб паэзія Шагала
Вам ляцець дапамагала.

Андрэй Хадановіч



М. Шагал. Слухаючы пеўня. 1944




М. Шагал. Сіні асёл. 1978



М. Шагал. Цырк. 1979 – 1981

# Верш

## Горад далёкі

Ён ува мне звініць,
далёкі горад,
дзе перагукваюцца, як суседкі, веры:
цэркаўкі белыя,
цэрквы далёкія
і сінагогі. Дзверы
расчынены. Неба цвіце,
жыцце ляціць,
упэўненае ў сваёй праваце.

Ён ува мне,
іхні смутак, ные,
нудзяцца вулкі крывыя,
надмогіллі шэрыя – на гары
ляжаць глыбока яўрэі набожныя,
сум з імі іхні, як свет стары.

У фарбах і ў мазках,
у святле і ценю
стаіць карціна мая ўдалечыні,
ёй сэрца сваё засланіць летуценю.

Іду я, разліты ўвесь і распалены,
зіхцяць гады, краса былая ўся.
Мой свет у сне
прыходзіць да мяне,
а я – а я губляюся.

Не шукайце сёння мяне
не шукайце і ў заўтрашні час,
я ўцёк ад самога сябе нечакана.
Я магілу выкапаю ў запас
і ад вялікага плачу растану.

Марк Шагал
(пераклад Рыгора Барадуліна)

# ГУЛЬНЯ

Марк Шагал вельмі любіў Віцебск
і часта маляваў яго, нават калі жыў
ужо ў Парыжы.

А які горад любіш ты? Намалюй яго
і жыхароў, якіх ты сам
хацеў бы сустракаць на вуліцах.

Падумай, як будуць рухацца людзі
па тваім горадзе, якога колеру
будуць дамы і колькі будзе
ў іх паверхаў.

МАЛЮЙ ТУТ

# Алеся Паслядовіч



23.04.1918, Мінск – 23.04.1988, Мінск

Алеся Паслядовіч – беларуская мастачка, графік, заслужаны дзеяч мастацтваў. У сваёй творчасці часта звярталася да фальклору, да вобразаў беларускай вёскі.

# Шэдэўр

А. Паслядовіч.
Залатыя конікі. 1973



? Што тут адбываецца?

Гэтая праца зроблена ў цёплых вохрыстых танах з чароўнымі залатымі адценнямі. Алеся Паслядовіч, як і Марк Шагал, любіла сваю радзіму, і ў яе творчасці часта можна ўбачыць вобразы, звязаныя з народнай культурай. Жанчына на карціне паказвае нам саламяную птушку. За яе спінай мы бачым шмат іншых цацак з саломы. Цікава, хто будзе з імі гуляцца?



А. Паслядовіч. Званочкі.
Нацюрморт. 1977

Ганна Кісліцына

# Папараць-кветка

Казка, напісаная паводле
карцін Алесі Паслядовіч

У даўнія часы беларускія хлопцы і дзяўчаты верылі, што ў купальскую ноч у лясных нетрах можна знайсці шчасце. Выглядае тое шчасце як маленькае вогнішча і завецца яно папараць-кветка. Той, хто знаходзіць папараць-кветку, можа загадаць ёй выканаць сваё самае запаветнае жаданне, і кветка абавязкова яго выканае.

Якіх толькі пажаданняў ні выконвала папараць-кветка... Дзяўчатам яна знаходзіла заможных жаніхоў, а хлопцаў знаёміла з найлепшымі прыгажунямі. Нехта патрабаваў ад кветкі куфар золата, хтосьці выпрошваў даражэзны аўтамабіль. Кветка пабудавала шмат замкаў, маёнткаў і простых дамоў. Каня, карову, авечку, сабачку і кошку людзі гэтаксама прасілі ў папараць-кветкі. У кожнага чалавека ёсць сваё запаветнае жаданне, свая мерка для вялікага шчасця. Была такая мерка і ў дзяўчыны Алесі.

На Купалле Алеся пайшла ў лес і знайшла папараць-кветку. Дзяўчына сарвала яе, загарнула ў шаўковую хустачку і загадала перанесці сябе з беларускай вёскі ў горад на Няве. У тым горадзе была

знакамітая акадэмія мастацтваў. Алеся марыла паступіць туды і вывучыцца на мастачку. Папараць-кветка дапамагла Алесі не толькі паступіць, але і стаць сапраўднай мастачкай.

Удзячная Алеся вырашыла намаляваць свой аўтапартрэт з чароўнай папараць-кветкаю ў руцэ. Тры дні дзяўчына малявала сябе і папараць-кветку. Партрэт атрымаўся выдатны. Ён быў такі цудоўны, што ўсе навучэнцы і выкладчыкі акадэміі прыходзілі на яго зірнуць. Мастакі глядзелі на партрэт і наглядзецца не маглі. Усе хвалілі Алесю і віншавалі з творчай удачаю.

На чацвёрты дзень намаляваная на партрэце кветка згасла і завяла. Самае дзіўнае, што яна не толькі згасла і завяла, а яшчэ і выпала з рукі ў намаляванай дзяўчыны і валялася пад мальбертам. Алеся выкінула змарнелую кветку на сметнік, і хуценька намалявала новую – свежую, сакавітую і агністую. Але і тая кветка праз якія тры хвіліны змарнела, завяла і выпала з рукі намаляванай дзяўчыны. І ў трэці раз кветка на карціне завяла. Тады Алеся разгарнула шаўковую хустачку і спытала ў сапраўднай папараць-кветкі, чаму так адбываецца з яе аўтапартрэтам. І тая адказала:

– Ты знайшла апошнюю папараць-кветку, што была ў Беларусі, і звезла яе ў горад на Няве. Ты, вядома, мела поўнае права на сваё шчасце. Ты зрабілася выдатнай мастачкай. Усе студэнты і выкладчыкі хваляць цябе. Ты гэта заслужыла, а я заслужыла права на вяртанне ў нашу з табой Беларусь.

Я прашу цябе вярнуцца на радзіму. Табе трэба прыехаць дадому і там маляваць, услаўляць нашых беларускіх людзей. Гэтым ты заслужыш вялікую павагу.

Яшчэ я прашу цябе, дарагая Алеся, вярні мяне ў нетры майго чароўнага лесу. Хай зноў у беларускім лесе заквітнее папараць-кветка. Я буду прыносіць шчасце людзям, якія знойдуць мяне ў купальскую ноч...

Алеся паслухалася кветку і вярнулася з горада на Няве ў нашу Беларусь. Дзяўчына пасялілася ў Мінску і ўсё сваё доўгае жыццё малявала тутэйшых майстроў. Яна малявала ганчароў, ільнаводаў, ткачых, спявачак, музыкаў... Малюнкі Алесі падабаліся людзям. А што яшчэ трэба мастаку?

Кожнаму трэба раз у жыцці знайсці чароўную папараць-кветку, і Алеся яе знайшла.



# Факты з жыцця

З 1938 года Алеся Паслядовіч вучылася ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме, які быў заснаваны Маркам Шагалам, а ў 1943 годзе паступіла ў Ленінградскую акадэмію мастацтваў, дзе вучылася ў вядомых мастакоў-графікаў Канстанціна Рудакова, Уладзіміра Канашэвіча і Генадзя Епіфанава.

У акадэміі мастацтваў Алеся Паслядовіч спачатку вучылася на аддзяленні жывапісу, але на чацвёртым курсе вырашыла перавесціся на графічнае аддзяленне. Графіка – від выяўленчага мастацтва, якое ствараецца пры дапамозе ліній, рысак, плям і кропак. Колер таксама выкарыстоўваецца, але, у адрозненне ад жывапісу, тут ён традыцыйна выконвае дапаможную ролю.

У 1957 годзе Паслядовіч вярнулася ў Мінск. Шмат падарожнічала па Беларусі і СССР, наведвала Балгарыю і Італію.

У 70-х мастачка стварыла серыю графічных нацюрмортаў. Нацюрморт перакладаецца з французскай мовы як «мёртвая прырода». У мастацтве гэта жанр, прысвечаны малюнку рэчаў, прадметаў і ежы. «Я стаўлюся да яго як да чалавека, хачу як бы ажывіць яго, выявіць яго ўнутраную сутнасць», – казала Алеся Паслядовіч пра нацюрморт.

Мастачка выкладала ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце.



А. Паслядовіч. Ткачыхі. 1973

# Верш

І восеньскія водары, і ціхі
Бабулін спеў у графіцы ўваскрэсне.
Антонаўскія яблыкі. Ткачыхі.
Палессе. Цуд. І песні, песні, песні.

Андрэй Хадановіч



А. Паслядовіч. Нацюрморт са снапом. 1977

# ГУЛЬНЯ

Алеся Паслядовіч любіла маляваць нацюрморты.

А якія рэчы падабаюцца табе?

Пастаў іх побач і паспрабуй намаляваць.

Можаш зрабіць нацюрморт з любімай ежы або з дарагіх табе цацак. Галоўнае, каб рэчы, абраныя для малюнка, былі для цябе важныя.



МАЛЮЙ ТУТ

# Уладзімір Цэслер



Нарадзіўся 30.04.1951, Слуцк

Уладзімір Цэслер – сучасны беларускі мастак, дызайнер. У яго працах часта з'яўляюцца вобразы поп-культуры (поп-культура, ці, яшчэ кажуць, «масавая культура» – гэта тое, што мы кожны дзень бачым у рэкламе на вуліцах, па тэлевізары або ў крамах). Жыве і працуе мастак у Мінску.

# Шэдэўр

У. Цэслер.
Супер-Давід. 2012



Супермэн – вядомы герой коміксаў. Яго ты, напэўна, ведаеш, а ці знаёмы ты з Давідам?

«Давід» – скульптура вядомага майстра эпохі Адраджэння Мікеланджэла. Уладзімір Цэслер апрануў біблейскі персанаж у касцюм супермэна і перанёс у наш час.



У. Цэслер і С. Войчанка.
Дванаццаць з XX. Серыя скульптур. 1996 – 2000

Адам Глобус

# Першы дзень

Казка, напісаная паводле серыі скульптур Уладзіміра Цэслера і Сяргея Войчанкі «Дванаццаць з XX»

Напачатку была ноч. Кругом было цёмна, змрочна і чорна. У цёмнай ночы на цёмнай зямлі ў цёмным лесе жыў Чорны Певень. У яго была жонка Чорная Курачка. Яна несла Чорнаму Пеўню чорныя яечкі. З іх выводзіліся чорныя кураняткі.

Здавалася, што так будзе заўсёды. Чорны Певень і Чорная Курачка будуць дзяўбці чорныя каменьчыкі і есці чорныя зярняткі. Чорная Курачка будзе несці чорныя яечкі, а з іх будуць выводзіцца чорныя куранядкі. Усе яны будуць жыць у цёмным лесе на цёмнай зямлі, над якой стаіць цёмная ноч. Але аднойчы Чорная Курачка шукала чорнае зярнятка, а замест яго знайшла зярнятка чырвонае. Курачка спытала ў Пеўня, ці можна ёй з'есці незвычайнае зярнятка. Певень падумаў-падумаў і дазволіў сваёй Курачцы з'есці яго. Яна здзяўбла зярнятка і праз тры дні знесла не чорнае, а чырвонае яечка. З яго вылупілася Чырвонае Куранятка, з якога неўзабаве вырасла Чырвоная Курачка. Цяпер у лесе гулялі не толькі чорныя, але і чырвоныя пеўнікі і курачкі.

Праз тры месяцы Чорная Курачка знайшла белае зярнятка. Яна шукала звычайнае чорнае зярнятка, а знайшла белае. Курачка спытала ў Пеўня, ці можна ёй здзяўбці яго. Певень падумаў і дазволіў сваёй Курачцы праглынуць белае зярнятка.

Праз тры дні Чорная Курачка знесла белае яечка, з яго вылупілася Белае Куранятка, з якога вырасла Белая Курачка. Тая знесла вялікае белае яечка. А з таго белага яечка выйшла не куранятка, а Жоўтае Сонца. Яно ўзнялося на неба. Як толькі Жоўтае Сонца ўзнялося на неба, скончылася ноч. Так зніклі чарната і цемра. Так пачаўся першы на свеце сонечны, цёплы і ясны дзень. Ён пачаўся з белага яечка, якое знесла Белая Курачка.






У.Цэслер. Лебядзінае возера. Пётр І. Чайкоўскі. Плакат. 2006



У. Цэслер і С. Войчанка. Лімон-ка. Плакат. 1994

# Факты з жыцця

- Нарадзіўся Уладзімір Цэслер у Слуцку 30.04.1951, у дзяцінстве займаўся ў слуцкай студыі выяўленчага мастацтва гарадскога дома піянераў і школьнікаў у мастака Уладзіміра Садзіна.
- Паступіў у тэатральна-мастацкі інстытут у Мінску з пятай спробы.
- З 1978 года мастак працаваў разам з Сяргеем Войчанкам.
- У 1984 годзе У. Цэслер аформіў вядомую ў коле мастакоў кнігу Ляніны Міронавай «Колеразнаўства».
- Адна з самых вядомых сумесных работ Цэслера і Войчанкі – «Праект стагоддзя. Дванаццаць з XX». Гэта дванаццаць яек вырабленых з розных матэрыялаў, якія сімвалізуюць выдатных асоб XX стагоддзя.
- У 2006 годзе ажаніўся са Святланай Знак, і ў іх нарадзіўся сын Якаў.

# Верш

Майстар Уладзімір Цэслер!
Ён малюе, піша, крэсліць.
Ён нясе мастацтва людзям.
Мы яго за гэта любім.

Лявон Вольскі




У. Цэслер. Галівудскія весялухі. Лубок. 2002

# ГУЛЬНЯ

Паглядзі на гэты помнік.
Знаёмы твар?

Магчыма, ты бачыў яго помнікі на вуліцах Мінска.
Гэта знакаміты беларускі пісьменнік Якуб Колас.

Здаецца, ён трохі засумаваў
у сваім шэрым касцюме.

Уладзімір Цэслер апрануў біблейскі персанаж у касцюм супермэна. Давай апранём Якуба Коласа ў што-небудзь вясёлае!



З. Азгур. Помнік Якубу Коласу. Мінск, 1972

## МАЛЮЙ ФАРБАЙ

# Генадзь Хацкевіч



3.06.1952, Мінск – 25.04.2014, Мінск

Генадзь Хацкевіч – мастак, які ўсё жыццё прыдумваў і ствараў нешта новае, вынаходзіў цікавыя і дзіўныя механізмы. Жыў і працаваў у Мінску.

# Шэдэўр

Г. Хацкевіч.
Жанчына і вокны. 1980-я гады



Разгледзь уважліва гэтую працу, што ты бачыш?

На гэтай карціне столькі дэталяў! Здаецца, быццам мастак спрабуе адлюстраваць адразу цэлы свет, і які ж ён незвычайны!



Г. Хацкевіч. Казка. 1980-я гады

Валянцін Акудовіч

# Генік і рука Бога

Казка, напісаная паводле творaў Генадзя Хацкевіча

Генік быў той яшчэ неслух. Здаецца, хлопчык увогуле нікога не слухаўся. Ні бацькоў, ні настаўнікаў, ні нават Бога, які стварыў увесь наш свет разам з людзьмі і зорамі. З апошнім Генік не пагаджаўся якраз таму, што боскі свет, які быў усюды, далёка не ўсюды яму быў даспадобы.

– Чаму ўсе дрэвы аднолькава зялёныя, а снег заўсёды белы? – абураўся Генік. – Чаму рэкі цякуць толькі ў адзін бок і ніколі не вяртаюцца назад? Чаму калі я выpacту ў дарослага, дык мама з татам абавязкова памруць? – дарэчы, гэта яму бачылася ці не самай вялікай памылкай Бога.

А далей я мушу заўважыць, што на свае нястомныя «чаму?» Генік не шукаў адказаў у бацькоў ці настаўнікаў. Ён пытаўся толькі ва ўсемагутнага Творцы. Але паколькі Той ні разу не адгукнуўся, дык, запытаўшыся, Генік у тую ж хвіліну пачынаў думаць, як можна самому выправіць чарговую хібу Бога. Напрыклад, Генік хай сабе і не адразу, аднак прыдумаў, што, каб мама і тата ніколі не памерлі, яму

проста не трэба вырастаць у дарослага. Зразумела, яшчэ можна трохі падрасці, аднак толькі трохі…

– Эх, каб я быў Богам! – сто разоў на дзень шкадаваў Генік. А часам нават і болей, бо ў ягонай галаве без спыну віравала процьма дзівосных думак, толькі хлопец не ведаў, якім спосабам хоць адну з іх спраўдзіць наяве.

Відаць, урэшце Богу надакучыла Генікава нэндза – і аднойчы. Ён вызірнуў з-пад бліжэйшай аблачынкі.

– Прывітанне, Генік, – усмешліва павітаўся Бог.

– Прывітанне, Бог, – Генік ад захаплення аж выцягнуўся на дыбачкі.

– І чаго ты ад Мяне хочаш? – запытаўся Бог.

Натуральна, Генік разгубіўся. Усе яго дзівосныя думкі адначасова загулі ў галаве, аж у вачах зрабілася цёмна. Бадай, таму ён міжволі выгукнуў:

– Хачу быць як сонца.

– А навошта? – здавалася, Бог трохі здзівіўся.

– Як Ты не разумееш? – цяпер здзівіўся Генік. – Каб сонца не было, мы заўсёды жылі б ноччу.

– Слушна, – пагадзіўся Бог і, прыціснуўшы аблачыну да зямлі, паклаў руку на Генікаву патыліцу. А потым вярнуўся на неба і ўжо адтуль прамовіў: – Бяжы дахаты і паглядзіся ў люстэрка.

Хлопчык пабег дахаты і, адно ступіўшы на ганак, адразу закрычаў:

– Ура-а-а!

Яго галава была рудая, як сонца. Цяпер нават увечары побач з Генікам можна было, не запальваючы

святла, чытаць кніжкі і часопісы.

Між іншым, не толькі галава, увесь ён зрабіўся нейкі сонечны. І хто б на яго ні паглядзеў, адразу светла ўсміхаўся. А вось самому Геніку было не да смеху, паколькі Бог не зрабіў яго таксама Богам. З гэтага хлопца штодня вярэдзіла роспач, бо ён, як і раней, не мог нічога перайначыць у свеце. Скажам, як было б файна, каб увечары кожны мог сам вызначаць, кім яму прачнуцца ранкам. І прачынаўся б чалавек кім заўгодна: кустом язміну пад акном, ластаўкай у небе, астранаўтам у космасе, рэчкай Свіслач, што сплывае ў мора, прыгожым матылём на поплаве… Карацей, кім заўгодна.

Для сябе Генік нават склаў даўжэзны спіс, у каго б ён хацеў ператварыцца. І ведаеце, першай у тым спісе значылася яго суседка па парце Караліна. Чаму яна заўсёды адпіхвае Геніка, калі ён залішне блізка падсоўваецца да яе? Пра гэта яму даведацца карцела яшчэ мацней, чым пра што іншае. Дый увогуле хлопчыку цікава было хоць трохі пабыць дзяўчынкай…

З кожным днём роспачы збіралася ўсё болей, і нарэшце Генік зразумеў, што далей няма як трываць. Трэба зноў ісці да Бога.

Генік вярнуўся на месца іх першай з Богам сустрэчы, аднак, колькі ні выглядаў у небе знаёмую аблачыну, нічога не выглядзеў. Заўтра было тое самае. І паслязаўтра… Можа, дзён дзесяць запар хлопчык пасвіў аблокі з хмаркамі, пакуль Бог яго

не пашкадаваў. Ён ахутаў Геніка самай сонечнай з аблачын, прытуліў да сябе і ціха сказаў на вуха:

– Генік, час табе ўжо зразумець, што нават Бог не можа спраўдзіць усё тое, што выдумляюць людзі. Таму ім і дадзена мастацтва. Гэта значыць уме-льства апісваць свае прыдумкі ў кнігах, маляваць на карцінах, здымаць у кіно. Табе што больш за ўсё падабаецца?

Геніку падабаліся мультфільмы, толькі ён нават не ўяўляў, як іх вытвараюць. А маляваў ён ужо даўно і з ахвотай…

– Гэта пакуль не мастацтва, – заўважыў Бог. – Табе трэба прасіцца ў школу, дзе адмыслова вучаць маляваць. І калі ты палюбіш сябе ў гэтай справе, Я ўласнай рукой падтрымаю тваю руку з пэндзлікам. Слова гонару.

Потым, калі праз гады і гады Генік зрабіўся знакамітым мастаком, я не аднойчы чуў на яго выставах: «Тут не абышлося без рукі Бога!» Тыя, што так казалі, гаварылі гэта ад захопленасці талентам Геніка. І толькі я ведаў, што так яно насамрэч і было…





Г. Хацкевіч. Амерыка. 1990-я гады

# Факты з жыцця

- Вучыўся ў дзіцячай мастацкай студыі Сяргея Каткова, Мінскім мастацкім вучылішчы ў Алега Луцэвіча, Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце на аддзяленні манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ў Гаўрылы Вашчанкі.

- Хацкевіч па-рознаму падпісваў свае карціны: Хацкевіч-Мінскі-Бамскі-Ленінскі, Хацкевіч-Мінскі.

- У 1987 годзе паспрабаваў захапіць самалёт, каб трапіць з Савецкага Саюза ў Парыж.

- Жыў мастак у Лондане і ў Парыжы ў 90-х гадах.

- Марыў набыць востраў.

- Пастаянна вынаходзіў розныя механізмы: лямпачка ў тэрмасе, якая працуе без электрычнасці; ровар, які развівае хуткасць 240 кіламетраў у гадзіну.



Г. Хацкевіч. Космас. 1990-я гады



Г. Хацкевіч. Космас. 1990-я гады

# Верш

Маляваў Генадзь Хацкевіч
Нетутэйшы дзіўны свет.
Там прадметаў розных безліч,
Сонцаў, зорак і планет.

Лявон Вольскі

# ГУЛЬНЯ

Як ты думаеш, якога вынаходніцтва не хапае нашаму свету?

Можа, персанальнага заркалёта, або генератара чыстай вады, ці чагосьці яшчэ?

Намалюй сваё вынаходніцтва, а таксама прыдумай, як яно будзе працаваць і дзе выкарыстоўвацца.

МАЛЮЙ ТУТ

# Людміла Русава



11.06.1954, пасёлак Дашчанае Архангельскай вобласці, Расія – 30.05.2010, Мінск

Людміла Русава – беларуская мастачка, найважнейшая прадстаўніца беларускага перформансу – найноўшай формы мастацтва. Жыла і працавала ў Мінску.

# Шэдэўр

Л. Русава. Гадзіннік.
Крышталі волі. 1996



## Як створана гэтая карціна?

Гэта габелен (вытканы ўручную дыван-карціна) з простым геаметрычным узорам. Як ты думаеш, што магло натхніць мастачку стварыць такі габелен і чаму яна не напісала карціну, а абрала больш складаны працэс стварэння малюнка?



Л. Русава. Фрактал. Геаметрыя часу. 1994

Ганна Кісліцына

# Эдгар

Казка, напісаная паводле творау Людмілы Русавай

Жыла-была дзяўчынка Люда. Яна любіла яркія колеры і фарбы. Дзяўчынка шмат малявала. Яна малявала жоўтыя гадзіннікі і блакітныя аблокі, чырвоныя цягнікі і сінія аўтамабілі. Люда малявала матылькоў і птушак, людзей, катоў і сабак.

Аднойчы дзяўчына намалявала вялікага павука. На белай паперы павук выглядаў зусім як жывы. Люда паказала сваёй маці малюнак.

– Які брыдкі павук! – маці ажно сцепанулася ад агіды.

– Мама, табе не падабаюцца чорныя павукі? – дзяўчынцы стала сумна ад таго, што мама не бачыць прыгажосці ў павуках.

– Так! Мне зусім не падабаюцца павукі і кляшчы, мухі і камары!

– Мама, а хто табе не падабаецца больш: мухі ці павукі?

– Мухі мне зусім не падабаюцца! Зусім!

– Мама, павук можа прагнаць з нашага дома ўсіх мух. Калі ты папросіш майго павука, ён паслухае цябе

і прагоніць іх усіх. За гэта ты дазволіш яму жыць у цёмным куточку пад нашай ваннай.

– Люда, калі ты так хочаш, я папрашу твайго чорнага павука прагнаць з нашага дома ўсіх мух... Дарагі чорны павук, будзь так ласкавы, прагані ўсіх мух з нашага дома!

Люда ўзрадавалася, што маці пасябравала з яе намаляваным павуком. Бо ў дзяўчынкі з'явілася надзея, што неўзабаве маці пасябруе і з сапраўдным павуком, які напраўду жыве ў цёмным куточку пад ваннай.

Дзяўчынка пайшла ў ванную і шэптам паклікала свайго таварыша чорнага павука:

– Эдгар! Эдгар! Хадзі сюды. Я паказала маці твой партрэт... Ты ёй не спадабаўся, але яна дазволіла табе жыць у цёмным куточку пад ваннай. Мама спадзяецца, што за гэты дазвол ты будзеш праганяць мух з нашага дома.

Павук Эдгар выйшаў з цемры на святло і падбег да Люды:

– Якая выдатная навіна! Люда, я вельмі ўдзячны табе і тваёй маці за дазвол жыць у вашым доме. За гэта я навучу цябе ткаць кілімы і габелены. Павукі лепш за ўсіх на свеце могуць працаваць з ніткамі.

Эдгар сапраўды навучыў дзяўчыну ткаць габелены і кілімы.

Калі Люда вырасла, яна стала знакамітай мастачкай, бо такіх цудоўных габеленаў, як ткала яна, не мог выткаць ніхто.

Ты, дарагі чытач, можаш падумаць, што чорны павук Эдгар мог вырасці і з'есці Люду і яе маці. На гэта я табе скажу так... Мух і гразі ў нашым свеце столькі, што хопіць на ўсіх павукоў і яшчэ застанецца.



Л. Русава. Зрух квадрата. Спіраль прычын. 1993

# Факты з жыцця

- Вучылася Л. Русава ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Сярод сваіх настаўнікаў Людміла вылучала Гаўрылу Вашчанку і Уладзіміра Стальмашонка.
- Стварыла шмат габеленаў, твораў станковага жывапісу і канцэптуальнага мастацтва. У сваіх працах Людміла Русава звярталася да досведу віцебскага авангарду пачатку XX стагоддзя і ідэй Казіміра Малевіча
- Працавала мастачкай на Барысаўскім камбінаце дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
- Удзельнічала Русава ў выставе «1+1+1+1+1+1=6», якая мусіла пачацца 12 лютага 1985 года і якую яшчэ да адкрыцця забараніла савецкая цэнзура.
- Зрабіла разам з Ігарам Кашкурэвічам у 1988 годзе першы ў Беларусі перформанс «Уваскрэсенне Казіміра». Перформанс – форма сучаснага мастацтва, якая аб’ядноўвае тэатр і выяўленчае мастацтва. Твор складаюць дзеянні мастака ў пэўным месцы і ў пэўны час.
- У 1998 годзе была выдадзена кніга Л. Русавай «Наскрозь», якая складалася з тэкстаў і графічных прац серыі «Забальзамаваны знак».



Л. Русава. Цішыня купалу. 1998



Л. Русава. Выціскальнае прасоўванне. 2001

# Верш

Русава Людміла
Шмат каго дзівіла,
Бо перформанс – сіла,
Калі ты – мастак:
Часам страшнаваты,
Бо не лялька з ваты.
Свет – не толькі святы.
А хіба не так?

Андрэй Хадановіч





Крыж, які рухаецца, 1997.
Перформанс Л. Русавай. Фота Д. Елісеева



Л. Русава. Штрыхі бязветранасці.
Арт-кніга«Наскрозь».1998

# ГУЛЬНЯ

Людміла Русава шмат працавала з узорамі, якія стварала з самых простых форм. Часам яны ператвараліся ў краты, а часам у патаемную мову з

дзіўнымі літарамі

Паспрабуй і ты прыдумаць і намаляваць

НОВУЮ МОВУ.

МАЛЮЙ ТУТ

# Руслан Вашкевіч



Нарадзіўся 12.02.1966, Мінск

Руслан Вашкевіч – беларускі мастак, куратар, прадстаўнік канцэптуальнага мастацтва. Жыве і працуе ў Мінску.

# Шэдэўр

Р. Вашкевіч.
Чэмпіёны свету. 2013



? Што тут адбываецца?

Руслан Вашкевіч сам кажа пра сваю працу так: «Гэтая карціна выяўляе ідэю канвеера, канала, перадачы з рук у рукі нейкіх вельмі сакрэтных ведаў».

Як ты думаеш, якую сакрэтную інфармацыю перадаюць адно аднаму людзі на гэтай карціне? Магчыма, геаметрычныя фігуры – гэта вобраз ідэі Казіміра Малевіча?



Р. Вашкевіч. Сіндром Папялушкі. 2012

Адам Глобус

# Чароўныя чаравічкі

Казка, напісаная паводле
карціны Руслана Вашкевіча
«Сіндром Папялушкі»

Маці папрасіла дачку Зосю вынесці смецце. У свае сем дзяўчынка лічыла сябе дарослай. Яна магла схадзіць у краму «Каравай» па хлеб, збегаць у прадуктовы па малако і вынесці смецце.

Каля кантэйнера з пластыкам Зося пабачыла новенькія чорныя чаравічкі. Было падобна, што памер іх акурат для Зосі. Дзяўчынка выкінула пакеты са смеццем і ўзяла адзін чаравік, каб лепей яго разгледзець. Чаравік быў зусім новы. Нібыта яго толькі што прынеслі з крамы. На падэшве ў яго была намалявана лесвічка. На скураной вусцілцы нехта намаляваў прыступкі.

Зося вырашыла памераць чаравік. Дзяўчына прысела на лаўку, зняла пантофлю і абула чаравік. Ён быў яе памера, але не толькі гэта здзівіла дзяўчыну. Ёй стала лёгка дыхаць, так лёгка і прыемна ёй ніколі раней не было. Зося абула другі чаравік, і дзяўчыне зрабілася яшчэ больш лёгка. Уся яна стала бязважкай, як матылёк. Дзяўчына стала такой

лёгкай у новых ёмкіх чаравічках, што змагла не толькі ісці па тратуары і па траве, але і падняцца ў паветра. Зося ішла ў паветры лёгкай хадою. Дзяўчына ўзнялася над дваром і над паркам. Па паветры яна перайшла на другі бок рэчкі.

Дзяўчынку, якая ішла па небе, заўважыла маладая маці, што гуляла ў парку з немаўляткам у калясцы: «Глядзіце, глядзіце, дзяўчынка ідзе па небе!» Людзі пачалі ўздымаць галовы і паказваць адно аднаму на дзяўчынку ў чыстым небе.

Зосі стала няёмка. Нармальны чалавек не вельмі любіць вылучацца з натоўпу. Асабліва калі вылучыўся раптоўна і ўпершыню. Зося пабегла па небе ў бок зялёнага скверыка. Там яна спусцілася на зямлю і зняла чароўныя чаравічкі.

Дадому Зося ішла басанож. Яна забрала свае пакінутыя каля сметніка старыя пантофлі. Знойдзеныя чорныя чаравічкі Зося схавала ў шафу з адзежай. Да лепшых часоў.





Р. Вашкевіч. Слоўны партрэт. 1995

# Факты з жыцця

- Вучыўся мастак у Беларускай акадэміі мастацтваў, якую скончыў у 1992 годзе. Сярод сваіх настаўнікаў Руслан Вашкевіч называе Гаўрылу Вашчанку і Уладзіміра Зінкевіча.

- Стварыў шэраг выдатных карцін, скульптур і твораў канцэптуальнага мастацтва. Зрабіў шмат персанальных выстаў, як у Беларусі, так і за мяжой.

- У 2005 годзе Руслан Вашкевіч удзельнічаў у 53 Венецыянскім біенале разам з мастакамі Уладзімірам Цэслерам, Сяргеем Войчанкам, Ігарам Цішыным, Наталляй Залознай, Андрэем Задорыным, Леанідам Хобатавым і Валерыем Шкарубам.

- У 2016 годзе Р. Вашкевіч паставіў сваю версію оперы «Перамога над Сонцам», якая была прыдумана ў 1913 годзе футурыстамі, а дэкарацыі да якой рыхтаваў Малевіч.

- У Руслана Вашкевіча пяцёра дзяцей.



Р.Вашкевіч. План уцёкаў. 2003

# Верш

Гэта не дзівацтва, гэта не вар'яцтва,
Гэта актуальнае айчыннае мастацтва.

Кожны хлопчык часам – хуліган і прыкаліст,
Ды не кожны – культавы мастак-постмадэрніст.

Паглядзіце працы, яны клёвыя, я ведаю!
Хто такі постмадэрніст? Зірніце ў «Вікіпедыю».

Андрэй Хадановіч



Р. Вашкевіч. Ня гледзячы ні на што. 2013



Р. Вашкевіч. Ня гледзячы ні на што.
Праект. 2013 – 2014



Р. Вашкевіч. Адзін дома. 2007



Р. Вашкевіч. Адзін дома. 2009

# ГУЛЬНЯ

Ад карціны «Чэмпіёны свету»
Руслана Вашкевіча мы пакінулі толькі
геаметрычныя фігуры.

Падумай, у што яны могуць ператварыцца?

Намалюй!





## МАЛЮЙ ТУТ

# КАМАНДА ПРАЕКТА



АДАМ ГЛОБУС



ІРЫНА ЛУКАШЭНКА



ГАННА КІСЛІЦЫНА



ВОЛЬГА МЖЭЛЬСКАЯ



ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ



ЛЯВОН ВОЛЬСКІ



АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ



BAZINATO



САФІЯ САДОЎСКАЯ

# ПАДЗЯКІ

Аляксею Андрэеву і Таццяне Арцімовіч

Нацыянальнаму Мастацкаму музею Рэспублікі Беларусь і Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею за падтрымку праекта і дазвол выкарыстоўваць фатаграфіі работ з калекцый.

Галерэі сучаснага мастацтва "Ў" за падтрымку на працягу ўсёй працы над кнігай.

Праекту CHOICE: Cultural Heritage – Opportunity for Civic Engagement.

Усім тым, хто падтрымаў гэты праект цягам краўдфандынгавай кампаніі. Гэта кніга існуе дзякуючы вам і для вас!

# ЗМЕСТ


| | |
|---|---|
| Казімір Малевіч | 8 |
| Марк Шагал | 26 |
| Алеся Паслядовіч | 42 |
| Уладзімір Цэслер | 54 |
| Генадзь Хацкевіч | 66 |
| Людміла Русава | 80 |
| Руслан Вашкевіч | 94 |

Літаратурна-мастацкае выданне

**Мастацтва Беларусі XX стагоддзя. Віцебская школа.**

Галоўны рэдактар У. Адамчык
Стылістычны рэдактар А. Хадановіч
Мастацкі рэдактар І. Стахіевіч
Карэктар А. Нанас
Каардынатар праэкта І. Лукашэнка
Асістэнт каардынатара В. Мжэльская

Аўтары казак
В. Акудовіч
А. Глобус
Г. Кісліцына

Аўтары вершаў
Л. Вольскі
А. Хадановіч

Аўтар гульняў і гістарычных даведак
С. Садоўская

Logvino Literatūros namai
J. Savickio 4, LT-01108 Vilnius

Друк BALTO print

Логвінаў

choice

Cultural Heritage: Opportunity for Improving Civic Engagement

дзіцячыя творчыя майстэрні

9 786098 147889

МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ XX СТАГОДДЗЯ ВІЦЕБСКАЯ ШКОЛА